# ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ ФАКТ І АДМЕТНАСЦІ ПАДЫХОДАЎ ДА ЯГО ЗМЕСТУ

Л.В. Мікалаева, к.г.н., дацэнт
УА “БДУІР”, г. Мінск

Адным з аспектаў метадалогіі гістарыяграфіі з’яўляецца гістарыяграфічны факт, што выступае ў якасці базавага матэрыяла для гістарыяграфічнага даследавання. Аналіз даследчыцкай і вучэбнай літаратуры паказвае, што паняцце “гістарыяграфічны факт” адносіцца да тых катэгорый гістарычнай навукі, якія не маюць адназначнага тлумачэння іх зместу. У савецкай гістарычнай навуцы праблемай зместу катэгорыі “гістарыяграфічны факт” займаліся вядомыя гісторыкі: М.В. Нечкіна, А.М. Сахараў, С.О. Шмідт, К.Н. Тарноўскі, А.І. Зевелеў, В.П. Навумаў, Я.Н. Гарадзецкі і інш. Аналіз іх творчай спадчыны дазваляе выдзеліць некаторыя розначытанні ў разуменні зместу дадзенай дэфініцыі.

Так, С.О. Шмідт выказваў меркаванне, што гістарыяграфічны факт ёсць аб’ект даследавання гістарыяграфіі. Ён вельмі часта з’яўляецца адначасова і асноўнай гістарыяграфічнай крыніцай для даследчыка. Такім чынам, у поглядах гэтага навукоўцыназіраецца тлумачэнне азначанай з’явы як змешванне аб’ектаў даследавання і асноўных крыніц іх пазнання [9, с. 7].

М.В. Нечкіна паставіла пытанне аб сутнасці гістарыяграфічнага факта. Адказваючы на яго, яна падкрэслівала, што навука складаецца ў першую чаргу з даследаванняў вучоных, а таму асноўным і важнейшым фактам гісторыі навукі з’яўляюцца працы вучонага. З яе пункта гледжання, працы гісторыка з’яўляюцца і першакрыніцай гістарыяграфіі як гісторыі навукі, і галоўным гістарыяграфічным фактам [6, с. 11]. Гістарыяграфічны факт невычарпальны, як атам, бо ён мае бясконцую колькасць якасцей, вартасцей, бакоў, узаемаадносін [6, с. 12].

Палемізуючы з С.О. Шмідтам, А.М. Сахараў лічыў неправамерным атаясамленне крыніцы і факта ў гістарыяграфічнай працы, бо падыход да фактаў гісторыі навукі не упадае з падыходам да іх як да крыніц. Ён пісаў, што “устанаўленне …факта магчыма толькі на аснове аналіза існуючых крыніц” [7, с. 22]. Пад гістарыяграфічным фактам А.М. Сахараў разумеў навуковыя веды, здабытыя даследчыкам у выніку пэўных навуковых аперацый, якія дазваляюць атрымаць інфармацыю пра працэс развіцця гістарычнай навукі, яе дзеячах, установах і арганізацыйных формах [7, с. 22].

Сваю думку аб змесце гістарыяграфічнага факта выказаў і К.М. Тарноўскі. На яго думку, пад гістарыяграфічным фактам трэба разумець “аўтарскую канцэпцыю, з большай ці меншай дакладнасцю і паўнатой выкладзеную ў даследаванні”. Навуковыя публікацыі (артыкулы, манаграфіі, рэцэнзіі), матэрыялы дыскусій і абмеркаванняў, рабочую дакументацыю (рукапісы, канспекты, кніжкі для запісаў) ён, у адрозненне ад многіх аўтараў, разглядаў як гістарыяграфічныя крыніцы [8, с. 7 – 13].

Класічным стала вызначэнне гістарыяграфичнага факта, дадзенае ў артыкуле А.І. Зевелева і В.П. Навумава: “Гістарыяграфічным фактам з’яўляецаа факт гістарычнай навукі, які нясе інфармацыю пра гістарычныя веды, што выкарыстоўваюцца для выяўлення заканамернасцей развіцця гісторыі гістарычнай навукі” [2, с. 95; 3, с. 36]. Прыведзенае вызначэнне ўключае наступныя крытэрыі: змест прадмета гістарыяграфіі, тлумачэнне сутнасці гістарычнага факта і яго суадносіны з гістарыяграфічным фактам, сацыяльна-палітычныя функцыі гістарыяграфіі, разуменне інфармацыйнага патэнцыяла навукі [2, с. 95]. Менавіта яго можна часцей за ўсё сустрэць у спецыялізаванай літаратуры.

Сучасны пункт гледжання на змест катэгорыі “гістарыяграфічны факт” прадстаўлены ў працах У.Д. Камыніна, які разумее пад гэтай дэфініцыяй канцэпцыю вучонага, рэалізаваную ім у адным ці некалькіх гістарычных сачыненнях [5, с. 63].

Побач з адрознасцю поглядаў даследчыкаў на змест катэгорыі “гістарыяграфічны факт”, можна прасачыць прыкладна адназначнае разуменне імі цэлага шэрагу тэарэтычна-метадалагічных палажэнняў. Па першае, разуменне таго, што гістарыяграфічны факт базуецца на гістарычным факце [2, с. 96]. Прычым гістарычны факт – больш шырокае паняцце [2, с. 98], бо гэта катэгорыя складае фундамент усяго будынка гістарычнай навукі. Яна існуе аб’ектыўна, незалежна ад таго, спазнаны ён ці не [4, с. 184]. Як вобразна выказалася М.В. Нечкіна, гістарычны факт з’яўляецаа жылплошчай для факта гістарыяграфічнага [6, с. 12]. З гэтага вынікае, што гістарыяграфічны факт – толькі частка факта гістарычнага.

Па-другое, гістарыяграфічны факт з’яўляецца зыходным матэрыялам для гістарыяграфічнай творчасці [2, с. 94]. Ён – прадукт творчасці суб’екта, знаходзіцца ў працэсе яго працы на “стыку” адзінства суб’екта з аб’ектам. Ён суб’ектыўны, бо з’яўляецца прадуктам творчасці суб’екта, а менавіта гісторыка. Сутнасць гістарыяграфічнага факта ў яго тлумачэнні, інтэрпрэтацыі. Важным для разумення з’яўляецца тое, што факты застаюцца, нават калі ўяўленні, што маюцца пра іх, аказваюцца ілжывымі. Быў факт зразумелы ці не, дакладны патлумачаны ці памылкова інтэрпрэтаваны – усё гэта не мяняе сутнасць справы. Сам факт аб’ектыўна існуе па-за свядомасцю гістарыёграфа, незалежна ад інтэрпрэтацыі, даследчыцкіх падыходаў і ацэнак [2, с. 97, 102].

Па-трэцяе, катэгорыя “гістарыяграфічны факт” – адна з важнейшых у шэрагу гістарыяграфічных паняццяў, складовы элемент у наступнай пабудове сістэмы высноў. Гістарыяграфічны факт часта вызначаецца як аб’ект даследавання гістарыяграфіі і факт гістарычнай навукі, што нясе інфармацыю пра гістарычныя веды. Гэта значыць пад гістарыяграфічным фактам разумеюцца нейкія веды пра падзею, з’яву ці працэс, якія мелі прамыя ці ўскосныя адносіны да гісторыі гістарычнай навукі і якія дазваляюць даследчыку скласці меркаванне пра яе развіццё [4, с. 184 – 185]. Гістарыяграфічны факт – гэта інфармацыя пра развіццё навукі, яе дзеячаў,

установы і арганізацыйныя формы. З’яўляючыся крыніцый інфармацыі, гістарыяграфічны факт мае прыкметы, што ўказваюць на яе характар, аб’ём, глыбіню, ступень дакладнасці. У адпаведнасці з гэтым ён валодае такімі паказчыкамі, як канкрэтнасць, індывідуальнасць, пераемнасць, паўтараемасць, апісальнасць, каб выдзеліць пэўны факт з сувязі з іншымі фактамі, вызначыць яго месца, ролю і значэнне ў гістрыі гістарычнай навукі [2, с. 103].

Разам з тым з прыведзеных вышэй вызначэнняў бачна, што кожны даследчык, даючы сваё бачанне гістарыяграфічнага факта, імкнуўся падкрэсліць найбольш важную на яго погляд асаблівасць, нейкую вызначальную рысу гэтага паняцця. Адрозненні можна патлумачыць тым, што база гістарыяграфічнага факта – гістарычны факт – катэгорыя выключна шматаспектная. Напрыклад, М.А. Барг выдзяляў тры ўзроўні гістарычнага факта: па-першае, факт-падзею, па-другое, факт, адлюстраваны ў гістарычнай крыніцы (паведамленне крыніцы), па-трэцяе, факт, асэнсаваны гісторыкам (канцэптуалізаваны факт) [1, с. 58 – 59].

А.И. Зевелеў таксама пісаў пра тры аспекты зместу катэгорыі “гістарычны факт”: па-першае, гістарычны факт як рэальная падзея, па-другое, гістарычны факт як інфармацыя, па-трэцяе, гістарычны факт як навуковае ўяўленне [2, с. 96 – 97; 4, с 186].

Такім чынам, паняцце “гістарычны факт” выкарыстоўваецца ў некалькіх значэннях. Па-першае, факт як падзея сапраўднай гістарычнай рэчаіснасці. Такія факты з’яўляюцца элементамі мінулага. Яны не толькі складаныя і разнастайныя, але і не могуць быць праверанымі эксперыментальным шляхам. Як з’явы мінулага, яны нязменныя і існуюць аб’ектыўна, па-за свядомасцю гісторыка, у сваёй прасторава-часавай завершанасці. Яны незалежныя ад іх інтэрпрэтацыі, даследчыцкіх падыходаў і ацэнак.

Па-другое, факт як паведамленне крыніцы. Гэтыя факты суб’ектыўныя, бо адлюстроўваюць бачанне падзей аўтарамі крыніцы. Шматлікія прыклады гісторыі неабвержна сведчаць пра тое, што адны і тыя ж падзеі па-рознаму адюстроўваюцца ў крыніцаў. У той жа час гэтыя факты аб’ектыўна існуюць ў адносінах да даследчыкаў і не залежаць ад таго, спазнаныя яны ці не, былі інфарматыўнымі ці “закансерваванымі”.

Па-трэцяе, факт як элемент лагічнай структуры гісторыі. Ён з’ўляецца адлюстраваннем пэўнай з’явы рэчаіснасці ў нашай свядомасці, прадуктам творчасці гісторыка. У гэтым сэнсе гістарычны факт можа разглядацца як факт гістарыяграфіі.

З цягам часу склалася перакананне ў тым, што пастаяннае і неперарыўнае развіццё гістарычнай навукі вядзе да пашырэння паняцця “гістарыяграфічны факт”. Тое, што яшчэ нядаўна не лічылася заслугоўваючым увагі, заўтра ўжо можа стаць важным гістарыяграфічным фактам. Неабходна пашыраць кола гістарыяграфічных фактаў за кошт прыцягнення новых дадзеных па гісторыіі гістарычнай навукі [4, с. 186].

Уяўляецца важным адбор фактаў, вызначэнне гыбіні і аб'ёма навуковай інфармацыі, яе ісціннасці і вартасці. Неабходна ўлічваць і час узнікнення канкрэтнага гістарыяграфічнага факта: "створаны" ён сучаснікам аналізуемых падзей ці аўтар апісвае іх з гістарычнай дыстанцыі, з рэтраспектыўнай пазіцыі. Светапоглядныя пазіцыі даследчыка непасрэдна ўплываюць на адбор гістарыяграфічных фактаў, якімі будзе аперавацт вучоны. Гэты тэзіс прымяняльны і да гістарычных фактаў. У працэсе перахода інфармацыі крыніцы ў гістарыяграфічныя веды даследчык свядома ці падсвядома кіруецца пэўнай сістэмай ці шкалой каштоўнасцей, прынятай у навуцы і грамадстве. Невыпадкова гістарыянрафічныя факты адлюстроўваюць не толькі такую з'яву ў навуцы, як барацьба канцэпцый, але і супрацьборства ідэалогій [4, с. 186].

Такім чынам, у наш час многія метадалагічныя аспекты, звязаныя з аналізам і ацэнкай гістарыяграфічных фактаў, сталі прадметам навуковых абмеркаванняў. Пры ўсёй іх дыскусійнасці бясспрэчным з'яўляецца перакананне, што гістарыяграфічны факт здольны іграць значымую ролю ў развіцці гістарычных ведаў.

Літаратура

1. Барг, М.А. Исторический факт: структура, форма, содержание/ М.А. Барг// История СССР. – 1976. – № 4. – С. 46 – 71.

2. Зевелев, А.И. Историографическое исследование: методологические аспекты: Учебное пособие для студентов вузов, обучающихся по специальности «История»/ А.И. Зевелев. – М.: Высшая школа, 1987. – 160 с.

3. Зевелев, А.И. Историографический факт: критерии оценок и анализа/ А.И. Зевелев, В.П. Наумов// Вопросы истории. – 1980. - № 5. – С. 32 – 41.

4. Ипполитов, Г.М. Историографический факт и историографический источник как категории исторической науки: непростая диалектика/ Г.М. Ипполитов// Известия Самарского научного центра Российской академии наук. – 2013. – Т. 15. – № 1. – С. 184 – 195.

5. Камынин, В.Д. Теоретические проблемы историографии как научной и учебной дисциплины на рубеже XX – XXI столетий/ В.Д. Камынин// Известия Уральского университета. – 2010. - № 3. – С. 54 – 66.

6. Нечкина, М.В. История истории (некоторые методологические вопросы исторической науки)/ М.В. Нечкина// История и историки: историография истории СССР. – М.: Наука, 1965. – С. 6 – 26.

7. Сахаров, А.М. О некоторых вопросах историографии историографических исследований/ А.М. Сахаров// Вестник Московского университета. Серия история. – 1973. - № 6. – С. 18 – 29.

8. Тарновский, К.Н. Социально-экономическая история России начала XX в.: советская историография середины 50-х – 60-х гг./ К.Н Тарновский. – М.: Наука, 1990. – 293 с.

9. Шмидт, С.О. О методике выявления и изучения материалов по истории исторической науки/ С.О. Шмидт// Труды/ Моск. гос. ист.-арх. ин-т. – М.: Наука, 1965. – Т. 22. – С. 3 – 49.